# ХУТАР ПАД ЗНОС

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

На думку старшыні райсавета, варта распрацаваць праграму па зносе такіх дамоў. Ударнай сілай могуць стаць меліяратары. Яны будуць выкарчоўваць пні і зносіць дамы, поўнасцю культываваць участак для калгасных пасеваў. Нешта накшталт праграмы меліярацыі, якой была ахоплена ўся краіна некалькі дзесяцігоддзяў таму. Зараз той напрамак сцішыўся, але з'явілася не менш адказная задача — пазбавіцца ад тысяч трухлявых хат. З удзелам меліяратараў за 3—5 гадоў можна значна прасунуцца ў справе зносу старых будынкаў і прывесці ў парадак тэрыторыю. Суразмоўнік прывёў прыклад Зэльвенскага раёна, дзе прадпрыемствам меліярацыйных сістэм знесена 43 дамы ў вёсцы. Але пакуль кожны райсавет гэту работу вядзе па-свойму. Хтосьці на кіраўніка СВК націскае, хтосьці на сельсавет. А ў гэты час колькасць дамоў-прывідаў толькі павялічваецца.

Праўда, некаторыя ўсе ж атрымліваюць другое жыццё. Так, адзін з хутароў выкупілі мясцовыя прадпрымальнікі, уладкавалі домік паляўнічага з адпачынкам, развіваюць турызм. На іншых новыя ўладальнікі адкрываюць аграсядзібы. Гэта таксама перспектыўны напрамак, разважае старшыня Воранаўскага райсавета, бо на тэрыторыі раёна 28 вадаёмаў, прыгожыя мясціны. Пустуючыя хаты ў такіх вёсках гараджане пачалі выкупляць пад дачы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

> З удзелам меліяратараў за 3—5 гадоў можна значна прасунуцца ў справе зносу старых будынкаў і прывесці ў парадак тэрыторыю.

Попытам карыстаюцца дамы на мяжы з Лідскім раёнам.

Ёсць прыклады, калі дзеці праз некаторы час засяляюцца ў дамы бацькоў. Так здарылася з сям'ёй з Літвы, якая вярнулася на радзіму. Яны адразу заняліся гаспадаркай, завялі карову, затым яшчэ некалькі. Малако здаюць у калгас і маюць добры прыбытак...

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** margo@zviazda.by

**• У ТЭМУ:**

**Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— У вобласці ствараецца рабочая група для вырашэння праблемы незаселеных дамоў, якіх у нас 47 тысяч, ці 27% ад агульнай колькасці. Асноўная праблема — у нашчадках, многія з якіх жывуць за мяжой, а на знос пабудовы патрэбен іх дазвол. Па шасці тысячах дамоў няма ніякіх апавяшчэнняў ад уладальнікаў — тут будзе весціся работа па зносе, бо часта пустуючыя дамы становяцца прытулкам бамжоў, базай для кантрабанды, ствараюць пажаранебяспечныя сітуацыі. Каб паскорыць знос такіх аб'ектаў, вядзецца работа па ўдасканальванні ўказа №100.

**На прадпрыемстве «Гроднамеліявадгас»** паведамілі, што пры наяўнасці дакументаў яны выконваюць работы па зносе старых дамоў. Калі такі заказ паступае, спецыялісты выязджаюць на месца, пасля чаго складаюць каштарыс. Праўда, аб'ёмы пакуль невялікія. У гэтым годзе такіх заказаў ад сельскіх Саветаў пакуль не было, хоць магутнасці для работы ёсць — філіялы прадпрыемства створаны амаль у кожным раёне вобласці. Яны гатовы падключыцца да сістэмнай работы па зносе трухлявых дамоў, была б толькі прапанова.

НАВІНЫ З РЭГІЁНАЎ

*Гомельская вобласць*

## ВЯРНУЦЬ У АБАРОТ

З лістапада 2016 па люты 2017 года колькасць аб'ектаў нерухомасці, што знаходзяцца на балансе дзяржаўных органаў і прадпрыемстваў і пры гэтым не выкарыстоўваюцца, зменшылася на 20%. Такую інфармацыю агучыў абласны тэрытарыяльны фонд дзяржаўнай маёмасці. Яшчэ ў кастрычніку колькасць незадзейнічаных аб'ектаў складала больш за 5000. З таго часу больш за 800 з іх было вернута ў гаспадарчы абарот або знесена. Найбольш актыўна гэтая работа ідзе ў Добрушскім, Жлобінскім, Кармянскім, Лоеўскім і Чачэрскім раёнах.

Каля паловы выяўленых дзяржаўных аб'ектаў плануецца прадаць сёлета. 30 пабудоў ужо рэалізавана праз аўкцыёны. Акрамя таго, падчас праверак было выяўлена 1000 адзінак нерухомасці, якая не выкарыстоўваецца і пры гэтым знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. У выпадку, калі невыкарыстанне такіх будынкаў у гаспадарчай дзейнасці даказана, падатак на нерухомасць і зямельны падатак з іх уласнікаў спаганяецца ў дзесяціразовым памеры.

Завяршыць рэалізацыю праекта па прыцягненні нерухомасці ў гаспадарчую дзейнасць плануецца на працягу 2017 года.

*Пастаўскі раён*

## АЎТОБУС ПА ЗАЯЎКАХ

Эканамічная сітуацыя прымушае супрацоўнікаў транспартнай галіны больш гнутка падыходзіць да абслугоўвання насельніцтва. Цяпер у шэраг населеных пунктаў аўтобус пастаўскага Аўтатранспартнага прадпрыемства №17 заязджае толькі па папярэдніх заяўках мясцовых жыхароў. Такія заходы ўжываюцца для эканоміі сродкаў. Таксама прадпрыемства знізіла кошт праезду па маршруце «Паставы — Мінск». Пры гэтым, па словах кіраўніцтва, выручка захавалася на ранейшым узроўні: дзяржаўным транспартам стала карыстацца больш пасажыраў.

*Гродзенская вобласць*

## БОЛЕЙ ЭКСКУРСІЙ, ЦІКАВЫХ І РОЗНЫХ

За два месяцы 2017 года школьнікі Гродзеншчыны выязджалі на экскурсіі ў пяць разоў часцей, чым за аналагічны перыяд летась. За студзень і люты адбылося амаль 5000 выездаў з мэтай наведвання музеяў, помнікаў архітэктуры і прыроды, а таксама прадпрыемстваў. Большая частка паездак адбывалася ў межах вобласці. Школы рэгіёна арыентаваныя на тое, каб кожны вучань раз на чвэрць пабываў на якой-небудзь пазнавальнай экскурсіі. Гэта не абавязкова далёкія падарожжы: перш за ўсё стаіць задача вывучыць сваю малую радзіму і краіну. Усяго ў Гродзенскай вобласці дзейнічае 345 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучаецца больш за 112 тысяч школьнікаў.



Фота БЕЛТА.

*Віцебская вобласць*

## ЖЫЦЬ СТАЛА ЛЕПЕЙ

У рэгіёне падвялі вынікі добраўпарадкавання за 2016 год. Усяго на паляпшэнне якасці жыцця выдаткавана 23 млн рублёў, з іх 5 — з абласнога бюджэту. У сельскагаспадарчы абарот прыцягнута 1650 га зямель, што выкарыстоўваліся неэфектыўна. Адрамантавана пакрыццё 400 км аўтадарог. Усталявана каля 1,5 тыс. кантэйнераў для раздзельнага збору смецця, у тым ліку каля 500 — у сельскай мясцовасці.

Аналізуючы вынікі працы па добраўпарадкаванні, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Цярэнцьеў падкрэсліў, што Віцебшчына мае на мэце стаць прыгожым кутком, дзе будзе камфортна не толькі яе жыхарам, але і гасцям. Для гэтага, на думку старшыні, не патрабуецца вялікіх фінансавых укладанняў. Галоўнае, каб органы мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемствы і арганізацыі, а таксама жыхары планамерна выконвалі пастаўленыя задачы.

У той жа час застаецца нявырашаным шэраг праблем. У многіх садовых таварыствах на тэрыторыі вобласці не арганізаваны вываз смецця. Найбольш праблемнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца Бешанковіцкі, Мёрскі, Пастаўскі, Шаркаўшчынскі і Шумілінскі раёны. Экалогіі рэгіёна таксама пагражаюць зараснікі баршчэўніка Сасноўскага. Шкодная расліна мусіць быць знішчана да пачатку мая-чэрвеня, калі пачынаецца яе цвіценне.

*Брэсцкі раён*

## СПОРТПЛЯЦОЎКА ЗА ГРОШЫ ЕС

Больш за 16 тысяч еўра са сродкаў Еўрасаюза сёлета выдзяляецца на стварэнне спартыўнага цэнтра на базе тутэйшай сярэдняй школы. «Спартыўная пляцоўка будзе пабудавана на тэрыторыі школы, — расказаў СМІ **старшыня сельскага Савета Уладзімір ХВАЦІК**, — але карыстацца ўсталяванымі трэнажорамі змогуць усе жыхары Дамачава і 14 вёсак, што знаходзяцца на тэрыторыі сельсавета».

Дамачаўскі сельсавет стаў адным з пераможцаў конкурсу праекта ЕС/ПРААН «Садзеянне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». На выйграны грант будуць пабудаваны варкаўт-пляцоўка з трэнажорамі пад адкрытым небам, зоны экалагічнага выхавання і адпачынку.

Гэта не першы грант, атрыманы Дамачавам ад Еўрасаюза. Адзін з папярэдніх праектаў дазволіў адрадзіць дамачаўскія кірмашы, што былі вядомыя яшчэ з XVIII стагоддзя. Усяго сёлета сродкі ад ЕС на агульную суму 431 тыс. еўра атрымаюць 22 ініцыятывы з Брэсцкай вобласці.

*Мінская вобласць*

## БЕСПРАЦОЎНЫМ ДАПАМОГУЦЬ

На базе тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва на Міншчыне адкрыліся кансультацыйныя пункты па пытаннях працаўладкавання. Кожны грамадзянін можа атрымаць у іх інфармацыю аб вакансіях, заработнай плаце і ўмовах працы. Саіскальнікам, якія звяртаюцца па інфармацыю, дапамагаюць звязацца з кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый і нават запісацца на гутарку.

У рэгіёне таксама мяркуецца распачаць кірмашы вакансій.